УДК 94(476)«1917»

І. М. Рыжанкоў, асістэнт

# ГАЛОЎНЫ І ГУБЕРНСКІЯ ЗЯМЕЛЬНЫЯ КАМІТЭТЫ НА ЗАВЯРШАЛЬНЫМ ЭТАПЕ ПАДРЫХТОЎКІ АГРАРНАЙ РЭФОРМЫ: ПА МАТЭРЫЯЛАХ БЕЛАРУСІ

In the article of activity of the Main thing and provincial ground committees in a direction of preparation of an agrarian reform in second half of 1917 is shined. Importance and ambiguity of the permission of an agrarian question, existence polar under the maintenance party agrarian programs Russia is considered. On the Belarus material features to an agrarian policy of the cabinets Time to the government reveal. The place of an agrarian question against events of October revolution is shown. Article is executed with use of archival materials, memoirs works and results of author's researches.

**Уводзіны.** У савецкі час аграрная палітыка кабінетаў Часовага ўрада не займала цэнтральнае месца ў коле тэматык гістарычных даследаванняў. Як правіла, яна набывала фонавы характар або асвятлялася з асуджальных пазіцый. У ліку такіх аўтараў Я. П. Лук'янаў, І. М. Ігнаценка, В. І. Кастрыкін і інш. На сучасным этапе шэраг расійскіх даследчыкаў (С. М. Арцёмаў, А. І. Дзіндараў, В. В. Лямін і інш.) актыўным чынам прысвячаюць гэтай праблеме кандыдацкія і доктарскія даследаванні. У беларускай гістарыяграфіі апошніх часоў трапляюцца артыкулы І. В. Гур'янавай аб працы зямельных камітэтаў, але не больш за тое.

**Асноўная частка.** На этапе разгортвання Лютаўскай рэвалюцыі сялянства Беларусі, як і ўсёй Расійскай дзяржавы, прыняла да ведама запэўніванні Часовага ўрада аб часе і ўмовах вырашэння зямельнага пытання і ў цэлым выконвала ўсе патрабаванні яго мясцовых органаў [1, с. 127–130]. З самага пачатку рэформы ход падрыхтоўкі да ажыццяўлення аграрнага пытання сустракаў істотныя перашкоды. Мала таго, па меры палітызацыі грамадскага жыцця і пагаршэння эканамічнага становішча ў краіне стваралася пагроза нармальнай падрыхтоўцы аграрнай рэформы. Асноўнай прычынай запавольвання гэтага працэсу на ўзроўні Міністэрства земляробства і Галоўнага зямельнага камітэта з'яўлялася процідзеянне з боку кадэцкіх міністраў у ажыццяўленні асноўнага патрабавання сялянскіх з'ездаў аб наданні зямельным камітэтам яшчэ да склікання Устаноўчага схода большых паўнамоцтваў у галіне распараджэння, у тым ліку размеркавання памешчыцкай, царкоўнай і іншай зямлёй.

Некаторы прагрэс у гэтым пытанні вызначыўся пасля ліпеньскага ўрадавага крызісу. Так, 12 ліпеня міністрам земляробства была ўхвалена пастанова, якая перадавала ўсе справы па продажы і залогу зямлі ў распараджэнне губернскіх зямельных камітэтаў. А 16 ліпеня выйшла ў свет інструкцыя В. М. Чарнова аб кампетэнцыі зямельных камітэтаў, у тым ліку ў сферы прыватнага землеўладання. Так, валасныя зямельныя камітэты набывалі права перадачы незапатрабаваных ворыўных зямель і сенакосаў у арэнду сялянам, што трапляла ў супярэчнасць з палажэннямі пастановы ад 11 красавіка, паводле якой незапатрабаванай зямельнай уласнасцю распараджаліся харчовыя камітэты [2, с. 766]. Прычым у выпадку адмовы вяскоўцаў плаціць уладальніку за арэнду грошы падлягалі перадачы павятовым зямельным камітэтам, якія вярталіся яму (уладальніку) толькі пасля ўплаты падаткаў. Акрамя таго, інструкцыя дазваляла зямельным камітэтам (у кантакце з харчовымі) перадаваць сялянам у карыстанне («пракат») незапатрабаваную прыватнаўласніцкую рабочую жывёлу і інвентар. Зямельныя камітэты займелі права нагляду за правільнай эксплуатацыяй лясоў, у тым ліку прыватнаўласніцкіх, а таксама водпуску яго жыхарам. У выніку замест установы, дзейнасць якой абмяжоўвалася пытаннямі падрыхтоўкі праекта аграрнай рэформы і вырашэння аграрных спрэчак, зямельныя камітэты выступілі ў якасці арганізацыі з паўнамоцтвамі дзяржаўнага органа ўлады.

Ізноў-такі відавочна, што азначаныя камітэты ў сваёй працы былі запраграмаваны перш за ўсё на забеспячэнне інтарэсаў працоўнага сялянства. Таму істотным фактарам, які стрымліваў класавую накіраванасць палітыкі міністра Чарнова ў аграрным пытанні, паслужыў цыркуляр міністра ўнутраных спраў І. Цэрэтэлі (меншавік), разасланы 18 ліпеня. У адпаведнасці з дакументам зямельным камітэтам належала прадухіляць спробы вяскоўцаў «самавольна ажыццявіць зямельную рэформу»; ствараць прымірэнчыя камеры, каб пасля Устаноўчага сходу «перадаць гэты [зямельны] фонд працоўнаму сялянству» [3, арк. 20–21]. Прычым міністр падкрэсліў у тэлеграме, што выключнае права распараджэння незапатрабаванымі ўгоддзямі – ворывам, сенакосамі, выганамі – належала харчовым камітэтам. На месцах распараджэнне І. Цэрэтэлі стала тэмай для абмеркавання і прыняцця канкрэтных захадаў. Так, 23 ліпеня Магілёўскі губернскі зямельны камітэт разаслаў ніжэйшым камітэтам цыркуляр, які пацвярджаў права харчовых камітэтаў на распараджэнне «свабоднымі» землямі. Валасным зямельным управам належала перагледзець

усе распараджэнні і пастановы аб здачы сенакосаў і палёў у арэнду без згоды ўладальніка [4, арк. 66]. На Віцебшчыне таксама прымаліся пэўныя меры да ўпарадкавання дзейнасці зямельных камітэтаў. 26 ліпеня на пасяджэнні прадстаўнікоў харчовых і зямельных камітэтаў Дрысенскага павета было вырашана неадкладна перадаць ад валасных зямельных камітэтаў да харчовых «незакончаныя справы па ўборцы ўраджаю і сенакосаў і па заворванні зямель» [5, арк. 195–196]. У жніўні А. А. Валковіч адзначаў, што зямельныя камітэты губляюць «свой аўтарытэт і замест рэформы магчымы бунт» [6, арк. 346–347]. Невыпадкова 14 жніўня Галоўны зямельны камітэт скасаваў рашэнні III і IV сесіі Віцебскага зямельнага камітэта аб «унясенні грошай за буйную арэнду не ўласнікам маёнтку», а на свой рахунак [7, арк. 348], а 26 жніўня скасаваў пастановы Магілёўскага зямельнага камітэта аб пераглядзе арэндных здзелак [8, арк. 111]. Мінскі губернскі камісарыят таксама бачыў рэальныя прычыны «шматлікіх дэфектаў дзейнасці зямельных камітэтаў» і 17 жніўня пастанавіў звярнуцца да Часовага ўрада з хадайніцтвам аб тэрміновым выданні ім заканапалажэнняў аб зямельных адносінах, прычым каб гэтае пытанне рэгулявалася не мясцовымі, а цэнтральнымі ўладамі. Можна меркаваць, што падобны праект ужо наспеў у нетрах урада, бо 4 верасня Галоўны зямельны камітэт абнародаваў «Агульны план дзейнасці губернскіх, павятовых і валасных зямельных камітэтаў па падрыхтоўцы зямельнай рэформы» [9, арк. 414].

Пэўнае ўдакладненне правоў зямельных камітэтаў, а таксама ўвядзенне ў жніўні-верасні крымінальнай адказнасці за гвалтоўныя захопы пасеваў, ураджаю, выгнанне рабочых і інш. істотна не адбілася на стане аграрнага руху. Характэрна, што менавіта зямельныя камітэты, а ніякія іншыя, зрабіліся асноўнымі парушальнікамі не толькі аграрнага, але і харчовага заканадаўства. Невыпадкова напрыканцы верасня Міністэрства земляробства прадпісала губернскім і павятовым зямельным камітэтам прыняць захады, «каб валасныя [зямельныя] камітэты не перашкаджалі збору хлябоў» [10]. Адначасова ў пастановах сялянскіх і сумесных з рабоча-салдацкімі дэлегатамі з'ездаў Беларусі ўзмацніліся патрабаванні да Часовага ўрада аб перадачы яшчэ да склікання Устаноўчага сходу ўсіх зямельных спраў у кампетэнцыю зямельных камітэтаў. Пры гэтым адпаведныя санкцыі, да прыкладу, аб перадачы сялянам памешчыцкай зямлі пад азімыя пасевы, аддаваліся губернскімі зямельнымі камітэтамі. Па сутнасці, не ставала толькі ўрадавага дакумента, якому належала б зафіксаваць de-jure тое, што адбылося de-facto. 10 кастрычніка адпаведную рэзалюцыю аб «выданні ў самым спешным парадку закона аб перадачы пад улік лясоў і прыватнаўласніцкіх маёнткаў з жывым і мёртвым інвентаром зямельным камітэтам» прынялі ўдзельнікі ўсіх зямельных і харчовых камітэтаў Віцебскай губерні ў прысутнасці прадстаўніка міністра земляробства Н. С. Асланава [11]. Характэрна, што менавіта ў гэты дзень і былі прыняты «Часовыя правілы аб ахове лясоў і іх рубкі» [12, с. 32–34]. Цяпер рубка леса дапускалася з дазволу губернскіх і павятовых зямельных камітэтаў. У выніку ўласнікі практычна поўнасцю пазбавіліся права свабоднага распараджэння лясной маёмасцю.

Варта адзначыць, што восенню, нягледзячы на ўход у адстаўку В. М. Чарнова, аграрная палітыка Міністэрства земляробства па-ранейшаму вызначалася паслядоўным адстойваннем інтарэсаў працоўнага сялянства. Так, на пачатку верасня камісіяй па размеркаванні зямельнага фонду Галоўнага зямельнага камітэта было распрацавана «Палажэнне аб ліквідацыі прыватнага землеўладання». Як адзначалася ў газеце «Могилевская жизнь» ад 12 верасня, буйныя сялянскія гаспадаркі, якія карысталіся наёмнай працай і валодалі «купчай» зямлёй, а таксама тое «землеўладанне, якое перавышала двайную норму землекарыстання спажывецкай працоўнай гаспадаркі», траплялі пад «ліквідацыю» нараўне з памешчыцкім. Такім чынам, аграрная палітыка Часовага ўрада адбывалася пад моцным уздзеяннем лідэраў ПС-Р, а таксама міністраў-сацыялістаў В. М. Чарнова, А. Ф. Керанскага, М. Дз. Аўксенцьева, С. Маслава. На Беларусі гэтая акалічнасць выявіла сябе ў амаль поўнай падпарадкаванасці эсэрам сялянскіх арганізацый, узначаленні імі многіх дзяржаўных органаў самакіраванняў, найбольшай папулярнасці іх партыі напярэдадні выбараў ва Устаноўчы сход. Але па многіх прычынах эсэрам не ўдалося давесці сваю зямельную праграму да лагічнага завяршэння. Важнейшая з іх – пралік у форме і выніках барацьбы за ўладу ў лістападзе 1917 г., а таксама недаацэнка палітычнай мабільнасці партыі бальшавікоў. Ужо ва ўмовах палітычнага крызісу, з прыходам 10 кастрычніка С. Л. Маслава на пасаду міністра земляробства [13, с. 348] ім быў распрацаваны законапраект аб перадачы прыватнаўласніцкай зямлі ў загадванне зямельных камітэтаў, які быў абнародаваны 25 кастрычніка, тады, калі ў Петраградзе ўжо фактычна пачалося ўзброенае паўстанне [14, арк. 4]. Невыпадкова таму, амаль адначасова з азначаным законапраектам, 26 кастрычніка здабыткам грамадскасці зрабіўся «Дэкрэт аб зямлі», складзены У. І. Леніным і прыняты дэлегатамі II Усерасійскага з'езда Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў. У адпаведнасці з ім усе землі, акрамя сялянскіх, пераходзілі ў загадванне валасных зямельных камітэтаў і павятовых Саветаў

сялянскіх дэпутатаў для далейшага размеркавання па працоўна-спажывецкай норме. Разам з тым права канчатковага вырашэння зямельнага пытання пакідалася дэпутатам Устаноўчага схода. У цэлым, складзены на аснове эсэраўскай зямельнай праграмы [15, с. 80] ленінскі дэкрэт па змесце амаль не адрозніваўся ад законапраекта міністра земляробства С. Маслава. З пачаткам узброенага паўстання ў Петраградзе лёс абодвух дакументаў залежаў ад вынікаў палітычнай барацьбы за дзяржаўную ўладу. Акрамя таго, ва ўмовах распачатай перадвыбарчай кампаніі ва Устаноўчы сход пытанне: хто – бальшавікі ці эсэры, «дасць сялянам зямлю» – набывала прынцыповы, вострапалітычны характар, таму ўсе партыі імкнуліся яшчэ да выбараў парламента ажыццявіць абвешчаныя аграрныя праекты.

Кожны з бакоў выкарыстоўваў свой арсенал сродкаў: бальшавікі і левыя эсэры – сілу Ваенна-рэвалюцыйных камітэтаў і рэарганізаваных Саветаў; эсэры – зямельныя камітэты. Пры гэтым першыя скіравалі сваю энергію на барацьбу супраць органаў Часовага ўрада на месцах і таму не мелі магчымасці арганізавана правесці канфіскацыю панскай маёмасці. А другія, маючы сетку зямельных камітэтаў і вопыт паўгадавой дзейнасці, такую магчымасць мелі і прыступіліся да яе ажыццяўлення больш асэнсавана. Так, ужо 5–6 лістапада на з'ездзе дэмакратычных арганізацый Магілёўскага павета была прынята рэзалюцыя аб пераходзе ўсіх зямель у загадванне зямельных камітэтаў пад наглядам Магілёўскага Савета сялянскіх дэпутатаў [16, арк. 116]. Працягваючы думку, варта ўзгадаць зварот да сялян ад 8 лістапада Мінскага губернскага зямельнага камітэта, які быў надрукаваны ў газеце «Социалист-Революционер» 16 лістапада. Выступіўшы з крытыкай дэкрэта аб зямлі, камітэт пацвердзіў свае паўнамоцтвы як «вамі ж (сялянамі) абранага і адданага вам органа» і заклікаў устрымацца ад не санкцыянаваных ім «выступленняў з боку валасных і павятовых зямельных камітэтаў... па ўзяцці зямель і іх распараджэнні».

Толькі з усталяваннем Савецкай улады бальшавікі здолелі надаць больш увагі сваёй аграрнай праграме. Важнейшым накірункам іх аграрнай палітыкі, у тым ліку на Беларусі, была арганізацыя ўліку і канфіскацыя панскай маёмасці. Створаны Часовым урадам апарат для рэалізацыі аграрнай рэформы – зямельныя камітэты – стаў у апазіцыю да Савецкай улады. Невыпадкова 25 лістапада новы віцебскі губернскі камісар П. І. Салонка ў сваім цыркуляры да валасных зямельных камітэтаў запатрабаваў неадкладна правесці перавыбары, каб ачысціць іх ад тых асоб, перакананні якіх супярэчылі рашэнням ІІ Усерасійскага з'езда, і ў хуткім часе ўзяць на ўлік памешчыцкую маёмасць [17, с. 291–292]. Паказальна тое, што новым уладам так і не ўдалося перацягнуць зямельныя камітэты на свой бок. Невыпадкова 15 снежня Віцебскі губернскі з'езд Саветаў у рэзалюцыі па аграрным пытанні патрабаваў распусціць існаваўшыя зямельныя камітэты, бо яны «не знаходзяцца на абароне інтарэсаў працоўных мас» [18, с. 49–50]. Неўзабаве пасля заняцця Стаўкі атрадамі М. В. Крыленкі, не раней як 21 лістапада, на адрас павятовых зямельных камітэтаў Магілёўшчыны (акрамя аршанскага і гомельскага) пайшлі тэлеграмы з прадпісаннем ажыццявіць канфіскацыю і ўлік памешчыцкай маёмасці [19, арк. 81].

У далейшым лідэры сялянскіх Саветаў і зямельных камітэтаў павялі гэту работу больш актыўна. Іншая справа, што ў дакуменце, прынятым з гэтай нагоды 26 лістапада губернскім зямельным камітэтам (старшыня М. П. Воранаў), адсутнічалі спасылкі на адпаведны дэкрэт СНК [20, арк. 160]. Але вядома, што яго далейшая дзейнасць ажыццяўлялася ў рэчышчы аграрнай палітыкі бальшавікоў. Фактычнае супадзенне аграрнай палітыкі абедзвюх партый прадухіліла адкрыты канфлікт органаў Савецкай улады з сялянскімі Саветамі Магілёўшчыны і абумовіла іх зблізкэнне. Лагічным завяршэннем гэтага працэсу стала прызначэнне работнікаў Саветаў і зямельных камітэтаў на адказныя пасады ў губернскі выканкам.

З перамогай у Петраградзе ўзброенага паўстання ажыццяўленне на Міншчыне ленінскіх дэкрэтаў мела найлепшыя з іншых губерняў шанцы па прычыне моцнага ў гэтым прыфрантавым рэгіёне ўплыву бальшавікоў. Але толькі пасля распаду Камітэта ратавання рэвалюцыі, склікання ІІІ з'езда Саветаў сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў і ўтварэння Абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і фронту рэалізацыя дэкрэта аб зямлі была пастаўлена ў практычную плоскасць. Таму, у прыватнасці, спрыяла стварэнне Камісарыята па зямельных справах на чале з левым эсэрам Дайнэкам [21, с. 62]. Але ў рэальнасці ўся справа засяродзілася ў руках абранага летам губернскага зямельнага камітэта, які і заняўся ажыццяўленнем аграрнай рэформы. Паводле ўспамінаў яго старшыні С. П. Каваліка, «з-за таго, што з'явіліся не столькі праціўнікі, колькі жадаўшыя па-свойму распараджацца работай зямельнага камітэта, то я палічыў мэтазгодным адправіць тады тэлеграму народнаму камісару земляробства, леваму эсэру Калегаеву, у якой апісваў стан спраў у спадзяванні атрымаць ад яго адабрэнне рабоце камітэта. Калегаеў не замарудзіў адказаць у пажаданым для мяне сэнсе, так што справа ў нас працягвалася ў ранейшым парадку да заняцця Беларусі немцамі» [22, с. 108].

**Заключэнне.** Такім чынам, асвятляючы дзейнасць зямельных камітэтаў Беларусі, варта

адзначыць наступныя акалічнасці: па-першае, яна адбывалася ва ўмовах спрыяльнай, у інтарэсах працоўнага сялянства аграрнай палітыкі Часовага ўрада; па-другое, па сацыяльным складзе губернскія зямельныя камітэты ўяўлялі сабой сялянска-інтэлігенцкія, а павятовыя і асабліва валасныя – пераважна сялянскія органы; па-трэцяе, па партыйнай прыкмеце членамі губернскіх і павятовых зямельных камітэтаў з'яўляліся эсэры (зрэдку энэсы), валасных – беспартыйныя сяляне.

У сукупнасці гэтыя фактары абумовілі паступальнае задавальненне сялянскіх патрэб у зямлі, пашы, лесе і г. д., а таксама паспяховую падрыхтоўку да аграрнай рэформы. Недасканаласць заканадаўчай базы ў вырашэнні зямельнага пытання, вузкапартыйныя інтарэсы арганізатараў сялянства, няспыннае пагаршэнне сацыяльна-эканамічнага і палітычнага становішча ў краіне і многае іншае выклікала шматлікія перавышэнні зямельнымі камітэтамі сваіх паўнамоцтваў, што ў сваю чаргу азначала пачатак аграрнай рэформы.

Прамаруджванне з выданнем закона аб перадачы ўсёй прыватнай, дзяржаўнай, царкоўнай зямлі ў распараджэнне зямельных камітэтаў тлумачылася процідзеяннем кадэцкіх міністраў, якія лічылі гэтую акцыю выключна прэрагатывай Устаноўчага схода. Выданне ленінскага дэкрэта аб зямлі, заснаванага на эсэраўскай аграрнай праграме, толькі дэкларавала асноўныя прынцыпы маючай адбыцца рэформы. На справе яе падрыхтоўка на Беларусі пачалася толькі ў снежні 1917 г., прычым у рэчышчы эсэраўскага праекта сацыялізацыі. З усталяваннем Савецкай улады на Беларусі кіраўнікі зямельных камітэтаў, нягледзячы на палітычныя рознагалоссі з бальшавікамі, бралі актыўны ўдзел у ажыццяўленні аграрнай рэформы.

### Літаратура


1. Рыжанкоў, І. М. Галоўны і губернскія зямельныя камітэты на пачатковым этапе падрыхтоўкі аграрнай рэформы: па матэрыялах Беларусі / І. М. Рыжанкоў // Труды БГТУ. Сер. V, Политология, философия, история, филология. – 2008. – Вып. XVI. – С. 127–130.
2. Собрание узаконений и распоряжений Правительства. За первую половину 1917 года. – Петроград: Сенатская типография, 1917. – 766 с.
3. Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь (далей НАРБ). – Фонд 60. Інстытут гісторыі партыі і сацыялістычнай рэвалюцыі пры ЦК КПБ. – Воп. 3. – Спр. 181.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей НГАБ). – Фонд 2679. Быхаўскі павятовы зямельны камітэт. – Воп. 1. – Спр. 5.
5. НАРБ. – Фонд 624. Віцебскі губернскі харчовы камітэт. – Воп. 1. – Спр. 4.
6. НАРБ. – Фонд 60. Інстытут гісторыі партыі і сацыялістычнай рэвалюцыі пры ЦК КПБ. – Воп. 3. – Спр. 243.
7. НАРБ. – Фонд 60. Інстытут гісторыі партыі і сацыялістычнай рэвалюцыі пры ЦК КПБ. – Воп. 3. – Спр. 243.
8. НГАБ. – Фонд 2679. Быхаўскі павятовы зямельны камітэт. – Воп. 1. – Спр. 5.
9. НГАБ. – Фонд 2679. Быхаўскі павятовы зямельны камітэт. – Воп 1. – Спр. 12.
10. Предписание земельным комитетам // Могилевская жизнь. – 1917. – 24 сент. – С. 4.
11. Совещание представителей и членов Губернского, уездных и волостных земельных и продовольственных комитетов Витебской губ. // Известия Витебского губернского Совета крестьянских депутатов. – 1917. – 17 окт. – С. 3–4.
12. Собрание узаконений и распоряжений Правительства. За вторую половину 1917 года. – Петроград: Сенатская типография, 1917. – 3234 с.
13. Политические партии России конец XIX – первая треть XX века. Энциклопедия. – М.: РОССПЭН, Российская политическая энциклопедия. – 1196 с.
14. НАРБ. – Фонд 60. Інстытут гісторыі партыі і сацыялістычнай рэвалюцыі пры ЦК КПБ. – Воп. 3. – Спр. 213.
15. История Беларуси: в 2 ч. / под ред. Я. И. Трещенка. – Могилев: МГУ им. А. А. Кулешова, 2005.– Ч. 2.– 310 с.
16. НАРБ. – Фонд 60. Інстытут гісторыі партыі і сацыялістычнай рэвалюцыі пры ЦК КПБ. – Воп. 3. – Спр. 168.
17. Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы: в 2 т. / редкол.: Г. С. Горбунов [и др.]. – Минск: Госиздат БССР, 1957. – Т. 1. Белоруссия в период подготовки социалистической революции (февраль – октябрь 1917 г.). – 1008 с.
18. Фих, Б. М. Аграрная революция в Белоруссии (1917–1920 гг.) / Б. М. Фих.– Минск: Высшая школа, 1966. – 414 с.
19. НГАБ. – Фонд 2679. Быхаўскі павятовы зямельны камітэт. – Воп. 1. – Спр. 9.
20. НГАБ. – Фонд 2679. Быхаўскі павятовы зямельны камітэт. – Воп. 1. – Спр. 5.
21. Сяменчык, М. Я. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 – сакавік 1918 гг.) / М. Я. Сяменчык: у 2 ч.– Мінск: БДПУ імя М. Танка, 2001. – Ч. II: Грамадска-палітычнае жыццё ва ўмовах складвання таталітарнага рэжыму. – 160 с.
22. Ковалик С. Ф. // Деятели СССР и революционного движения России: энциклопедический словарь Гранат. – М., 1989. – 108 с.